# РАЗДЕЛ 1
# МЕЖДУНАРОДНЫЕ ОТНОШЕНИЯ. ГОСУДАРСТВО И ПРАВО. ПОЛИТОЛОГИЯ. ИСТОРИЯ

## Патрабаванні да кандыдата ў натарыусы ў Рэспубліцы Беларусь і Рэспубліцы Польшча (параўнальны аспект)

*Ангельскі У. М., асп. БДУ,*
*нав. кір. праф. Доўнар Т. І., д-р юр. навук*

Патрабаванні да кандыдата ў натарыусы ў Рэспубліцы Беларусь замацаваны ў артыкуле 2 Палажэння «Аб арганізацыі дзейнасці натарыусаў у Рэспубліцы Беларусь», якое зацверджана Указам Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь «Аб арганізацыі натарыяльнай дзейнасці ў Рэспубліцы Беларусь» [1]. Згодна з артыкулам 2 адзначанага палажэння натарыусам у Рэспубліцы Беларусь можа быць грамадзянін Рэспублікі Беларусь, які мае вышэйшую юрыдычную адукацыю і стаж працы па юрыдычнай спецыяльнасці не менш за тры гады, які адбыў у выпадках, прадугледжаных палажэннем, прафесійную стажыроўку ў якасці стажора натарыуса і здаў кваліфікацыйны іспыт, а таксама атрымаў пасведчанне на ажыццяўленне натарыяльнай дзейнасці і адпавядае іншым патрабаванням заканадаўства. Артыкул такога ж зместу ўтрымлівае праект Закона Рэспублікі Беларусь «Аб унясенні змяненняў і дапаўненняў у некаторыя законы Рэспублікі Беларусь па пытаннях натарыяльнай дзейнасці». Адзначаны праект закона ўносіць змяненні і дапаўненні ў Закон Рэспублікі Беларусь ад 18 ліпеня 2004 г. «Аб натарыяце і натарыяльнай дзейнасці» і выкладае яго ў новай рэдакцыі [2].

Патрабаванні да кандыдата ў натарыусы ў Рэспубліцы Польшча замацаваны ў Законе Рэспублікі Польшча «Права аб натарыяце» [3]. Згодна з артыкулам 11 адзначанага закона натарыусам можа быць прызначаны той, хто мае польскае грамадзянства, грамадзянства іншай дзяржавы — члена Еўрапейскага саюза, дзяржавы — члена Еўрапейскай асацыяцыі вольнага гандлю — боку пагаднення аб Еўрапейскай эканамічнай зоне ці Швейцарскай канфедэрацыі — альбо грамадзянства іншай дзяржавы, калі яму на аснове прадпісанняў Еўрапейскага саюза прадстаўляецца права працаўладкавання і самаўладкавання на тэрыторыі Рэспублікі Польшча

па правілах, вызначаных у тых прадпісаннях, і ён карыстаецца ў поўнай меры публічнымі правамі, мае поўную грамадзянскую дзеяздольнасць, беззаганны характар і гарантуе належнае выкананне прафесіі натарыуса, атрымаў ступень магістра юрыспрудэнцыі ў Рэспубліцы Польшча альбо замежны юрыдычны дыплом, які прызнаецца ў Рэспубліцы Польшча, адбыў натарыяльную аплікацыю ў Рэспубліцы Польшча, здаў натарыяльны экзамен у Рэспубліцы Польшча, мае 26 год.

Як у Рэспубліцы Беларусь, так і ў Рэспубліцы Польшча, да кандыдатаў у натарыусы прад'яўляюцца павышаныя патрабаванні ў параўнанні з большасцю іншых прафесій. Гэта выклікана асаблівай роляй і значэннем натарыята ў грамадстве і дзяржаве. Дзейнасць натарыята накіравана на рэалізацыю суб'ектыўных правоў і абавязкаў удзельнікаў праваадносін, забеспячэнне законнасці здзелак, недапушчэнне ўзнікнення спрэчак і зваротаў у суд. Яна садзейнічае папярэджанню правапарушэнняў, надае пісьмоваму дакументу асаблівую публічную і доказную сілу, а ў пэўных выпадках сілу выканаўчага дакумента, умацоўвае правапарадак і стабільнасць грамадзянскага абароту.

Прафесія натарыуса, як у Польшчы, так і ў Беларусі, патрабуе юрыдычных ведаў, таму кандыдат, у першую чаргу, павінен мець вышэйшую юрыдычную адукацыю, а не эканамічную ці сярэднюю спецыяльную юрыдычную. Аднак заканадаўства Рэспублікі Беларусь не рэгулюе пытання аб месцы атрымання адукацыі, і на практыцы можа ўзнікнуць такая сітуацыя, калі грамадзянін Беларусі атрымаў тытул магістра юрыспрудэнцыі ў вышэйшай навучальнай установе Польшчы, жадае стаць натарыусам у Рэспубліцы Беларусь. Пры гэтым ён адпавядае ўсім іншым крытэрыям, устаноўленым заканадаўствам. Лічым, што ў такім выпадку ў адзначаным палажэнні і праекце закона Рэспублікі Беларусь існуе прававы прабел, які неабходна ліквідаваць шляхам унясення змен і дапаўненняў у артыкул 2 Палажэння і ў артыкул 18 праекта закона Рэспублікі Беларусь. Прапануем выкласці адпаведныя артыкулы ў наступнай рэдакцыі: «…які мае вышэйшую юрыдычную адукацыю, атрыманую ва ўстанове адукацыі Рэспублікі Беларусь ці ў замежнай навучальнай установе, калі адпаведны дыплом прызнаецца ў Рэспубліцы Беларусь». Артыкулы ў такой рэдакцыі будуць азначаць, што асобы, якія атрымалі дыпломы за мяжой, пры адсутнасці прававых падстаў прызнання іх дыпломаў у Рэспубліцы Беларусь, не будуць адпавядаць патрабаванням заканадаўства, устаноўленым да кандыдатаў у натарыусы, і не змогуць імі стаць да часу, пакуль не атрымаюць адукацыю, адпаведную заканадаўству аб натарыяце і натарыяльнай дзейнасці Рэспублікі Беларусь.

Такім чынам, патрабаванні да кандыдатаў у натарыусы, устаноўленыя заканадаўствам Рэспублікі Беларусь у асноўным падобныя да адпаведных патрабаванняў польскага заканадаўствам, аднак патрабуюць пэўнага ўдасканалення.

**Літаратура**

1. Об организации нотариальной деятельности в Республике Беларусь : Указ Президента Республики Беларусь, 27 ноября 2013 г., № 168 // Кансультант Плюс : Беларусь. Тэхналогія 3000 [Электронны рэсурс] / ГАА «ЮрСпектр», Нац. цэнтр прававой інфарм. Рэсп. Беларусь. — Мінск, 2014.

2. Праект Закона Рэспублікі Беларусь «Аб унясенні змяненняў і дапаўненняў у некаторыя законы Рэспублікі Беларусь па пытаннях натарыяльнай дзейнасці» // [Электронны рэсурс]. — Рэжым доступу : http://pravo.by. — Дата доступу : 17.11.2014.

3. Prawo o notariacie. Ustawa RP z dnia 14 lutego 1991 r. [Электронны рэсурс]. — Рэжым доступу : isap.sejm.gov.pl. — Дата доступу : 17.11.2014.

# Особенности реализации политики ассоциации Европейского союза в отношении Украины

*Барахвостов П. А., магистрант БГУ,*
*науч. рук. Русакович А. В., канд. ист. наук, доц.*

В настоящее время региональные интеграционные объединения стали неотъемлемым и важным элементом международной системы. Среди них особое место занимает Европейский союз. Существенную роль во внешней политике альянса играет «восточный вектор» — политика в отношении соседних с Евросоюзом стран Восточной Европы, целью которой является создание зоны безопасности и процветания вдоль собственных границ. Особое место во внешнеполитической деятельности ЕС занимает Украина, что обусловлено относительно высоким уровнем развития экономики данного государства, существующей политической культурой его народа, а также важностью региона для России в силу сложившихся тесных экономических, социальных и культурных связей.

В 2008 г. на Парижском саммите «Украина — ЕС» Евросоюз заявил о готовности предложить Украине Соглашение об ассоциации. Принятие соглашения не предполагает непосредственного членства в ЕС; оно направлено на распространение ценностей и ряда преимуществ европейского интеграционного объединения за пределы Евросоюза. Вместе с тем принятие документа означает возложение на себя определенных обязательств перед ЕС, выражающихся в приближении законодательства и административных процедур государства к соответствующим нормам и процедурам ЕС в различных областях, тесных политических связях, сотрудничестве в сфере безопасности и др.